Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 4. С. 20–24.

УДК 94(476):[323.2(438):378.184]

# СТУДЭНЦКІЯ КАРПАРАЦЫІ ВІЛЕНСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА І МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА ПОЛЬСКІХ УЛАД У 1920–1930-я гг.

UDC 94(476):[323.2(438):378.184]

# STUDENT CORPORATION VILNIUS UNIVERSITY AND YOUTH POLICY OF THE POLISH AUTHORITIES 1920–1930

**В. І. Крывуць,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін БарДУ*

**V. Krivut,**
*Candidate of History, Associate Professor of the Chair of social and humanitarian disciplines of Baranovichi State University*

Паступіў у рэдакцыю 16.10.17.

Received on 16.10.17.

Артыкул прысвечаны развіццю студэнцкага руху на тэрыторыі Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя ў міжваенны перыяд. Адной з распаўсюджаных форм ідэйна-выхаваўчых аб'яднанняў студэнцкай моладзі з'яўляліся студэнцкія карпарацыі. Яны былі шырока прадстаўлены ў Віленскім універсітэце. Найбольш уплывовыя з іх былі цесна звязаны з польскімі нацыяналістычнымі коламі і знаходзіліся ў правай апазіцыі да «санацыйнага» рэжыму. Адначасова існаваў шэраг праўрадавых карпарацый, а таксама карпарацый, якія прадстаўлялі нацыянальныя меншасці міжваеннай польскай дзяржавы. Польскія ўлады пры правядзенні сваёй маладзёжнай палітыкі былі вымушаны ўлічваць факт дамінавання сваіх праціўнікаў сярод студэнтаў-карпарантаў. У барацьбе з польскімі нацыяналістамі яны спрабавалі абапірацца на «свае», праўрадавыя карпарацыі. Адначасова была зроблена спроба змяніць сітуацыю праз абмежаванне акадэмічнай аўтаноміі. Аднак ліквідаваць уплыў польскіх нацыяналістычных карпарацый сярод віленскіх студэнтаў улады не здолелі.

*Ключавыя словы:* Віленскі ўніверсітэт, студэнцкія карпарацыі, маладзёжная палітыка, маладзёжны рух.

The article is devoted to the development of the student movement in the Vilnius Stefan Batory University in the interwar period. One of the common forms of ideological and educational associations of students were student corporation. They were well represented in the Vilnius University. The most influential of these were closely connected with the Polish nationalist circles and were in the right-wing opposition to the regime of "remediation". At the same time there were a number of pro-government corporations, and the corporations that represented national minorities of the interwar Polish state. The Polish authorities during their youth policies were forced to take into account the fact of the dominance of their opponents among corporant students. In the struggle with the Polish nationalists they tried to rely on "their" pro-government corporations. At the same time an attempt was made to change the situation through the restriction of academic autonomy. However, the attempt to eliminate the influence of the Polish nationalist corporations among the students of Vilnius authorities has failed.

*Keywords:* Vilnius University, student corporations, youth policy, youth movement.

Вывучэнне ўдзелу студэнцкіх арганізацый у грамадскім жыцці і ажыццяўленні афіцыйнай маладзёжнай палітыкі носіць актуальны характар. У сувязі з гэтым вялікае значэнне мае і вывучэнне гістарычнага вопыту ў дадзенай сферы. У тым ліку гэта адносіцца і да дзейнасці студэнцкіх арганізацый у Віленскім універсітэце імя С. Баторыя (УСБ) у міжваенны перыяд. Вынікі даследавання дазволяць не толькі скласці больш аб'ектыўную карціну грамадска-палітычнага жыцця 1920–1930-х гг., але і будуць мець практычную каштоўнасць у якасці прыкладу ідэйна-выхаваўчай дзейнасці ў маладзёжным асяроддзі. Дадатковую актуальнасць гэтай праблематыцы надае тое, што яна яшчэ не знайшла належнага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі. Беларускія гісторыкі доўгі час асноўную ўвагу надавалі дзейнасці камсамола Заходняй Беларусі, яго барацьбе за ўплыў на моладзь, у тым ліку і на віленскіх студэнтаў. У працах жа польскіх гісторыкаў разглядаўся міжваенны студэнцкі рух, галоўным чынам, на непасрэдна польскіх тэрыторыях [1–3]. Фактычна дзейнасць студэнцкіх карпарацый УСБ

Репозиторий БГПУ

і яе сувязь з афіцыйнымі мерапрыемствамі ў студэнцкім асяроддзі заставаліся па-за ўвагай айчынных і замежных даследчыкаў, якія не стварылі асобных прац, прысвечаных менавіта гэтай праблеме. Задачай артыкула – ліквідаваць гэты прабел і на аснове дакументальных крыніц і матэрыялаў польскай гістарыяграфіі прааналізаваць развіццё віленскіх студэнцкіх карпарацый у кантэксце дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

Віленскі ўніверсітэт быў адзінай вышэйшай навучальнай установай на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. УСБ з'яўляўся арэнай актыўнай дзейнасці шматлікіх студэнцкіх саюзаў. Вядома, што ў 1937/38 навучальным годзе тут працавалі 73 студэнцкія арганізацыі [4, с. 174–177].

Неабходна адзначыць, што ў адпаведнасці са статутам УСБ студэнцкія арганізацыі не маглі мець палітычных мэтаў, а на іх сходах маглі абмяркоўвацца толькі пытанні ўніверсітэцкага жыцця [5, с. 35–36]. Аднак віленскія студэнцкія аб'яднанні сталі аб'ектам барацьбы палітычных груповак міжваеннай польскай дзяржавы. У Віленскім універсітэце, як і ў іншых універсітэтах, дамінавалі польскія нацыяналісты з арганізацыі «Усепольская моладзь» (УМ). Яна была створана ў сакавіку 1922 г., у той жа час ячэйка УМ узнікла і ў Вільні [6, с. 96]. У 1930-х гг. «Усепольская моладзь» фактычна з'яўлялася маладзёжнай секцыяй Нацыянальнай партыі, якая знаходзілася ў правай апазіцыі да аўтарытарнага рэжыму «санацыі». Унутры кожнай універсітэцкай ячэйкі УМ існавалі секцыі для кіраўніцтва іншымі маладзёжнымі арганізацыямі, дзякуючы гэтаму і забяспечвалася дамінаванне польскіх нацыяналістаў у студэнцкім асяроддзі [7, с. 33]. У Вільні прыхільнікамі УМ лічылася каля паловы мясцовых студэнтаў. Гэта было меней, чым у іншых універсітэтах, што тлумачыцца значным працэнтам студэнтаў-непалякаў [1, с. 23–25]. Апошнія мелі свае арганізацыі, у тым ліку саюзы беларускіх, украінскіх і рускіх студэнтаў [4, с. 175]. Свае асобныя арганізацыі – навуковыя гурткі, аб'яднанне ўзаемадапамогі, спартыўны саюз – мелі і студэнты-яўрэі. Таксама ў УСБ актыўна дзейнічала і левая апазіцыя – цесна звязаны з камсамолам саюз «Фронт». Праўрадавы лагер быў прадстаўлены такімі «санацыйнымі» арганізацыямі, як Саюз польскай дэмакратычнай моладзі, Легіён маладых, «Дзяржаўная думка». Пры гэтым польскія ўлады актыўна выкарыстоўвалі адміністратыўны рэсурс і пэўныя заканадаўчыя меры, каб усталяваць свой кантроль над віленскім студэнцтвам і яго фармальна апалітычнымі арганізацыямі.

Да такіх арганізацый адносіліся і студэнцкія карпарацыі – элітарныя аб'яднанні, якія мелі характар мужчынскіх таварыскіх клубаў. Пачатак гэтых арганізацый узводзяць да т. зв. «нацый» сярэдневяковых французскіх і італьянскіх універсітэтаў, якія аб'ядноўвалі студэнтаў з адной краіны ці правінцыі. З XVI ст. такія зямляцтвы існавалі ў нямецкіх універсітэтах. Менавіта на аснове іх і сфарміраваліся студэнцкія карпарацыі сучаснага тыпу [8, с. 178, 179]. Першымі былі карпарацыі ці «буршэншафты», «Армінія», «Германія» і «Тэўтонія», створаныя ў 1815 г. у Енскім універсітэце. Тады ўпершыню былі распрацаваны адметныя знакі карпарацый і іх унутраная іерархія [8, с. 190].

Да першай паловы XIX ст. адносіцца і пачатак польскага карпарацыйнага руху. Прынята лічыць, што традыцыі польскіх студэнцкіх карпарацый заклалі філаматы і філарэты, тайныя таварыствы віленскіх студэнтаў, існаваўшыя ў 1817–1823 гг. Пасля іх разгрому царскімі ўладамі частка віленскіх студэнтаў выехала ў Дэрпт (Тарту). Там яны стварылі Польскі саюз, які ў маі 1828 г. быў ператвораны ў карпарацыю «Палонія». Яна прыняла формы нямецкіх карпарацый – «буршэншафтаў», спалучыўшы іх з польскімі патрыятычнымі ідэаламі. У 1919 г., пасля адраджэння польскай дзяржавы, «Палонія», у адпаведнасці з тэстаментам сваіх заснавальнікаў, перанесла сваю рэзідэнцыю ў Вільню [3, с. 8; 9, с. 3].

У 1921 г. «Палонія» і яшчэ шэсць карпарацый правялі з'езд, на якім стварылі Саюз польскіх акадэмічных карпарацый (СПАК). Ён павінен быў займацца арганізацыйнымі праблемамі карпарацыйнага жыцця і ўмацаваннем пазіцый карпарацый ва ўніверсітэтах. СПАК распрацаваў «Арганічны статут польскай акадэмічнай карпарацыі», які быў асновай для статутаў саюзных карпарацый. Згодна з ім, карпарацыя з'ўлялася ідэйна-выхаваўчым аб'яднаннем польскай студэнцкай моладзі. Праз супрацоўніцтва ў цесным коле калег-сяброў яна павінна была падрыхтаваць сваіх членаў да грамадзянскай працы ў імя Айчыны. Ідэйная дэкларацыя, якая ўтрымлівалася ў статуце, сцвярджала, што мэтай жыцця кожнага карпаранта з'яўляецца «праца ў імя Польшчы, у імя яе велічы і моцы». Карысць нацыі і дзяржавы лічылася

Рэпазіторый БДПУ

«вышэйшым законам, мерай маральных каштоўнасцей, прыкладам дзеяння». Карпарант павінен быў супрацьстаяць усім плыням і памкненням, якія ставяць асабістыя, партыйныя і класавыя інтарэсы вышэй інтарэсаў нацыі і дзяржавы. Таксама ён павінен быў разумець «небяспеку чужых элементаў, якія пагражаюць Найяснейшай Рэчы Паспалітай стратай адзінага нацыянальнага характару». Адзначалася неабходнасць абароны польскіх інтарэсаў у духоўнай і матэрыяльнай сферах. У карпарацыях павінен быў панаваць «дух дэмакратызму, братэрскага адзінства, роўнасці». Гаварылася, што «кожны паляк з'яўляецца для карпаранта братам» [10, с. 49, 50]. Усе гэтыя ідэйныя пастулаты пераклікаліся з ідэямі «Усепольскай моладзі». Таму, пачынаючы з 1923 г., у час выбараў органаў студэнцкага самакіравання саюзныя карпарацыі выстаўлялі сваіх кандыдатаў у адным спісе з польскімі нацыяналістамі [3, с. 13].

Карпарацыі, якія ўваходзілі ў СПАК, павінны былі захоўваць выключна польскі нацыянальны характар. У іх склад не прымаліся людзі, якія дэкларавалі нямецкую ці ўкраінскую нацыянальнасць, а таксама тыя, хто вызнаваў іўдаізм. Аднак у карпарацыі дапускаліся студэнты, якія хаця і мелі «чужое» паходжанне, але лічылі сябе палякамі і з'яўляліся хрысціянамі. Таксама членамі саюзных карпарацый не маглі быць прыхільнікі камуністычнай і сацыялістычнай партый і масоны [3, с. 11–12].

Члены карпарацый падзяляліся на актыўных і пасіўных (філістараў). У сваю чаргу актыўныя члены падзяляліся на кандыдатаў (фуксаў) і паўнапраўных (камільтонаў). Статут прадугледжваў, што колькасць членаў адной карпарацыі не павінна перавышаць 100 чалавек. Па прыкладзе нямецкіх «буршэншафтаў» кожная карпарацыя мела дэвіз, герб, сцяг, манаграму, адметныя знакі (шапкі і шалікі) [10, с. 52, 53]. Таксама па ўзоры нямецкіх студэнцкіх саюзаў польскія карпаранты перанялі дуэльны кодэкс. Характэрна, што на III з'ездзе СПАК была прынята пастанова, якая забараніла дуэлі з прадстаўнікамі іўдзейскага веравызнання, «паколькі яны абапіраюцца на этыку Талмуда» [11, с. 45].

Міжваенны гады сталі перыядам росквіту карпарацый, у тым ліку і ў Вільні, дзе існавала 25 такіх арганізацый. Найбольш уплывовымі былі члены СПАК «Палонія», «Баторыя» (заснавана ў 1922 г.), «Палесія» (1925 г.), «Крэсовія» (1926 г.), «Леаніданія» (1927 г.), «Канкордзія Вільненсіс» (1927 г.) і «Філаматыя Вільненсіс» (1928 г.) [12]. Неабходна адзначыць, што амаль усе гэтыя карпарацыі былі звязаны з УМ і Нацыянальнай партыяй, хоць СПАК неаднаразова дэклараваў сваю апалітычнасць. У Вільні найбольш актыўна ў польскім нацыяналістычным руху ўдзельнічала карпарацыя «Палесія», у сувязі з чым у 1937 г. Міністэрства адукацыі нават часова прыпыніла яе дзейнасць [13, с. 40–42].

Адначасова некаторыя віленскія карпарацыі выступалі на баку «санацыі». Так, на мяжы 1920–1930-х гг. ва ўніверсітэце разгарнулася барацьба за кантроль над мясцовай арганізацыяй студэнцкай узаемадапамогі «Брацкая дапамога». Доўгі час нацыяналісты з УМ пры падтрымцы карпарацый «Палесія», «Леаніданія», «Баторыя» і «Канкордзія Вільненсіс» дамінавалі ў гэтым аб'яднанні. Іх праціўнікі стварылі выбарчы блок, у які разам з праўрадавымі саюзамі ўвайшлі таксама карпарацыі «Вільненсія» (1925 г.), «Пілсудзія» (1926 г.) і «Крэсовія» [14, с. 184–185]. Узначаліў гэты блок Г. Дэмбінскі, кіраўнік мясцовага аддзялення Саюза каталіцкай акадэмічнай моладзі «Адраджэнне» і адначасова член карпарацыі «Філаматыя Вільненсіс». У далейшым ён стаў адным з кіраўнікоў пракамуністычнай арганізацыі «Фронт». Аднак поспехі канкурэнтаў УМ былі даволі сціплымі, яны здолелі ўзначаліць «Брацкую дапамогу» толькі ў 1931/32 навучальным годзе [1, с. 30].

У 1932 г. польскія ўлады зрабілі спробу аб'яднаць праўрадавыя карпарацыі. Па ініцыятыве арганізацыі «Дзяржаўная думка» была створана Федэрацыя польскіх акадэмічных карпарацый (ФПАК). Вільню ў ёй прадстаўлялі «Вільненсія», «Пілсудзія» і «Крэсовія» (апошнюю карпарацыю ў сувязі з гэтым выключылі з СПАК). Аднак вялікіх поспехаў федэрацыя не дасягнула і праіснавала вельмі кароткі час [3, с. 27].

Акрамя таго, віленскія карпарацыі «Снядэцыя» (1926 г.) і «Канрадыя» (1926 г.) уваходзілі ў малаўплывовае клерыкальнае Аб'яднанне польскіх хрысціянскіх акадэмічных карпарацый (АПХАК). Таксама ў Вільні існавалі «дзікія» карпарацыі, якія не з'яўляліся членамі агульнапольскіх карпарацыйных аб'яднанняў: «Брыгадзія», «Арыенцыя», «Тартарыя», «Корпус Стэфан Чарнецкі», «Гладыя». Большасць з іх мела

Рэпазіторый БДПУ

даволі эфемерны характар і не адыгрывала значнай ролі ў студэнцкім жыцці [12].

Асаблівасцю карпарацыйнага руху УСБ было існаванне непольскіх карпарацый. Так, студэнты-яўрэі стварылі карпарацыі «Унітанія» (1926 г.), «Іарданія» (1929 г.), «Хасманея» (1930 г.) і «Бетарыя» (1931 г.) [15, с. 7–14]. Карпарацыя «Рутэнія» аб'ядноўвала нешматлікіх рускіх студэнтаў [3, с. 29]. Карпарацыі «Круты» і «Запарожжа» стварылі студэнты-ўкраінцы. На карпарацыйных прынцыпах будавалася дзейнасць Саюза нямецкіх студэнтаў у Вільні. На дадзены момант пра дзейнасць гэтых карпарацый вядома не шмат, часта мы не ведаем нават дакладнай даты іх стварэння.

Больш звестак мы маем адносна дзейнасці беларускай карпарацыі «Скарынія», створанай у 1931 г. беларускімі паланафіламі. Згодна з архіўнымі крыніцамі, з самага пачатку існавання «Скарынія» атрымлівала фінансавую і арганізацыйную падтрымку з боку польскіх улад [16, арк. 18, 19]. Першапачаткова, дзякуючы гэтай падтрымцы, карпарацыя разгарнула актыўную дзейнасць па прыцягненні студэнтаў-беларусаў на свой бок. Аднак ужо ў 1934/35 навучальным годзе ўніверсітэцкае кіраўніцтва распусціла «Скарынію» па прычыне ўнутраных канфліктаў сярод беларускіх паланафілаў [17, с. 11]. Адзіным «дасягненнем» карпарацыі стаў раскол сярод нешматлікіх студэнтаў-беларусаў УСБ.

Паколькі «санацыйныя» ўлады ва ўніверсітэтах цярпелі паражэнне ў барацьбе з польскімі нацыяналістамі, яны ўзялі курс на абмежаванне акадэмічнай аўтаноміі. Сур'ёзным ударам па карпарацыям было ўвядзенне ў 1933 г. новага заканадаўства аб студэнцкіх арганізацыях. Яно дазваляла ставіць пад кантроль Міністэрства адукацыі дзейнасць усіх студэнцкіх аб'яднанняў. Таксама забаранялася стварэнне міжуніверсітэцкіх саюзаў, такім чынам ліквідаваўся СПАК [18, с. 156–163].

У адказ на гэтыя рашэнні ва ўніверсітэтах Польшчы пракацілася хваля студэнцкіх пратэстаў. У Вільні яна пачалася ў пачатку сакавіка 1933 г. Іх узначалілі аб'яднаныя польскія нацыяналісты і прыхільнікі камуністаў. Рэктар прыпыніў заняткі. Аднак поўнага адзінства сярод віленскага студэнцтва не было. Праўрадавыя арганізацыі, у тым ліку і некаторыя карпарацыі, члены ФПАК, асудзілі студэнцкія хваляванні як камуністычную акцыю і звярнуліся з просьбай аднавіць заняткі [19, с. 3].

Што тычыцца карпарацыйнага руху, то, нягледзячы на новае заканадаўства, СПАК прыпыніў сваю дзейнасць толькі часова. Акрамя таго, у другой палове 1930-х гг. польскія ўлады пайшлі на частковае вяртанне ўніверсітэцкай аўтаноміі [1, с. 50]. Адначасова некаторыя дзеячы «санацыі» паспрабавалі ўступіць у дыялог з польскімі нацыяналістамі, у тым ліку і са студэнцкімі карпарацыямі. Так, у маі 1937 г. маршал Э. Рыдз-Сміглы наведаў сход карпарацыі «Палонія». На сустрэчу былі запрошаны і прадстаўнікі іншых віленскіх карпарацый. Аднак большасць з іх праігнаравала гэта запрашэнне [20, с. 38].

Такім чынам, можна адзначыць, што ў міжваенны перыяд студэнцкія карпарацыі з'яўляліся прыкметнай часткай студэнцкага жыцця Віленскага ўніверсітэта, як сярод польскіх студэнтаў, так і сярод прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў Польшчы. Найбольшы ўплыў набылі карпарацыі ідэалагічна блізкія польскім нацыяналістам з «Усепольскай моладзі». «Санацыйныя» ўлады вымушаны былі ўлічваць гэта пры праўдзенні сваёй маладзёжнай палітыкі. Першапачаткова яны спрабавалі стварыць «свае» карпарацыі ў супрацьвагу апанентам з СПАК. Пасля правалу гэтай спробы быў узяты курс на абмежаванне ўніверсітэцкай аўтаноміі. Аднак і гэтыя мерапрыемствы не мелі поспеху. На працягу ўсяго міжваеннага перыяду польскія нацыяналісты і іх саюзнікі з карпарацый здолелі захаваць дамінуючыя пазіцыі сярод большай часткі віленскага студэнцтва.


Літаратура

1. *Pilch, A.* Studencki ruch polityczny w Polsce 1932–1939 / A. Pilch. Warszawa: PWN, 1972. – 179 s.
2. Hillebrandt, B. Polskie organizacje młodzieżowe XIX i XX wieku: zarys historii / B. Hillebrandt. – Warszawa: MAW, 1986. – 479 s.
3. *Muszyński, W.* II Rzeczpospolita korporancka / W. Muszyński // Glaukopis. – 2003. – № 1. – S. 7–60.

References

1. *Pilch, A.* Studencki ruch polityczny w Polsce 1932–1939 / A. Pilch. Warszawa: PWN, 1972. – 179 s.
2. *Hillebrandt, B.* Polskie organizacje młodzieżowe XIX i XX wieku: zarys historii / B. Hillebrandt. – Warszawa: MAW, 1986. – 479 s.
3. Muszyński, W. II Rzeczpospolita korporancka / W. Muszyński // Glaukopis. – 2003. – № 1. – S. 7–60.


Рэпазіторый БДПУ

4. Skład Uniwersytetu w roku akademickim 1938/39 // Rocznik Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie 1938–1939. – Wilno: Nakładem USB, 1939. – S. 123–180.
5. Statut tymczasowy Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie. – Wilno: Wydawnictwo Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnich, 1919. – 36 s.
6. Przegląd życia akademickiego // Alma mater Vilnensis. Jednodniówka „Dnia Akademika». – Wilno: Wydawnictwo Bratniej Pomocy Polskiej Młodzieży Akademickiej USB, 1922. – S. 94–96.
7. *Muszyńsk, W.* Z dziejów Stronnictwa Narodowego (1928–1947) / W. Muszyński // Biuletyn Institutu Pamięci Narodowej. – 2007. – № 8 – 9. – S. 25–50.
8. *Ćwietlik, J.* Korporacje niemieckie / J. Ćwietlik, Z. Krzemiński // Rocznik Korporacyjny 1828 – 1928. – Warszawa: Drukarnia Techniczna, 1928. – S. 178–194.
9. Stulecie konwentu Polonja // Kurjer Wileński. – 1928. – 13 października. – S. 3.
10. Statut organiczny polskiej korporacji akademickiej // Rocznik Korporacyjny 1828–1928. – Cz. 2. – Warszawa: Drukarnia Techniczna, 1928. – S. 49–61.
11. Rys historyczny Polskiego ruchu korporacyjnego // Rocznik Korporacyjny 1828 – 1928. – Warszawa: Drukarnia Techniczna, 1928. – S. 4–95.
12. *Wróblewski, B.* Wileńskie środowisko korporacyjne w latach 1918–1939 / B. Wróblewski // Archiwum Korporacyjne [Электронны рэсурс]. – 2017. – Рэжым доступу: http://www.archiwumkorporacyjne.pl/index.php/muzeum-korporacyjne/wilno/html. – Дата доступу: 21.09.2017.
13. *Laszczkowski, M.* Byli sobie Polesiusze... czyli szkic do dziejów Korporacji Akademickiej Polesia / M. Laszczkowski // Glaukopis. 2009. – № 15 – 16. – S. 35–50.
14. *Filaszkiewicz, O.* Bratnia Pomoc Polskiej Młodzieży Akademickiej Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie / O. Filaszkiewicz // Rozprawy naukowe i zawodowe państwowej Wyższej Szkoły Zawodowej w Elblągu. – 2011. – Zeszyt 12. – S. 181–192.
15. *Pater, D.* Żydowski Akademicki Ruch Korporacyjny w Polsce w latach 1898–1939 / D. Pater // Dzieje Najnowsze. – 2002. – № 3. – S. 3–20.
16. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 242 п. – Оп. 1. – Д. 435.
17. *Малецкі, Я.* Праўда пераможа / Я. Малецкі // Шлях моладзі. – 1934. – № 7–8. – С. 10–11.
18. Rozporządzenie Ministra Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego z dnia 30 kwietnia 1933 r. o stowarzyszeniach akademickich // Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. – 1933. – № 4. – S. 156–163.
19. Przeciw strajkowi // Słowo. – 1933. – 8 marca. – S. 3.
20. *Kuczyński Z.* Bomba pod Uniwersalem. Wspomnienia wileńskiego terrorysty / Z. Kuczyński // Glaukopis. – 2012. – № 25–26. – S. 18–42.

4. Skład Uniwersytetu w roku akademickim 1938/39 // Rocznik Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie 1938–1939. – Wilno: Nakładem USB, 1939. – S. 123–180.
5. Statut tymczasowy Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie. – Wilno: Wydawnictwo Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnich, 1919. – 36 s.
6. Przegląd życia akademickiego // Alma mater Vilnensis. Jednodniywka „Dnia Akademika». – Wilno: Wydawnictwo Bratniej Pomocy Polskiej Młodzieży Akademickiej USB, 1922. – S. 94–96.
7. *Muszyńsk, W.* Z dziejyw Stronnictwa Narodowego (1928–1947) / W. Muszyński // Biuletyn Institutu Pamięci Narodowej. – 2007. – № 8 – 9. – S. 25–50.
8. *Ćwietlik, J.* Korporacje niemieckie / J. Ćwietlik, Z. Krzemiński // Rocznik Korporacyjny 1828 – 1928. – Warszawa: Drukarnia Techniczna, 1928. – S. 178–194.
9. Stulecie konwentu Polonja // Kurjer Wileński. – 1928. – 13 października. – S. 3.
10. Statut organiczny polskiej korporacji akademickiej // Rocznik Korporacyjny 1828–1928. – Cz. 2. – Warszawa: Drukarnia Techniczna, 1928. – S. 49–61.
11. Rys historyczny Polskiego ruchu korporacyjnego // Rocznik Korporacyjny 1828 – 1928. – Warszawa: Drukarnia Techniczna, 1928. – S. 4–95.
12. *Wryblewski, B.* Wileńskie środowisko korporacyjne w latach 1918–1939 / B. Wryblewski // Archiwum Korporacyjne [Elektronny resurs]. – 2017. – Rezhym dostupu: http://www.archiwumkorporacyjne.pl/index.php/muzeum-korporacyjne/wilno/html. – Data dostupu: 21.09.2017.
13. *Laszczkowski, M.* Byli sobie Polesiusze... czyli szkic do dziejyw Korporacji Akademickiej Polesia / M. Laszczkowski // Glaukopis. 2009. – № 15 – 16. – S. 35–50.
14. *Filaszkiewicz, O.* Bratnia Pomoc Polskiej Młodzieży Akademickiej Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie / O. Filaszkiewicz // Rozprawy naukowe i zawodowe państwowej Wyższej Szkoły Zawodowej w Elblągu. – 2011. – Zeszyt 12. – S. 181–192.
15. *Pater, D.* Żydowski Akademicki Ruch Korporacyjny w Polsce w latach 1898–1939 / D. Pater // Dzieje Najnowsze. – 2002. – № 3. – S. 3–20.
16. Natsyyanalny arkhiu Respubliki Belarus. – F. 242 p. – Op. 1. – D. 435.
17. *Maletski, Ya.* Prauda peramozha / Ya. Maletski // Shlyakh moladzi. – 1934. – № 7–8. – S. 10–11.
18. Rozporządzenie Ministra Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego z dnia 30 kwietnia 1933 r. o stowarzyszeniach akademickich // Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. – 1933. – № 4. – S. 156–163.
19. Przeciw strajkowi // Słowo. – 1933. – 8 marca. – S. 3.
20. *Kuczyński Z.* Bomba pod Uniwersalem. Wspomnienia wileńskiego terrorysty / Z. Kuczyński // Glaukopis. – 2012. – № 25–26. – S. 18–42.